*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

**БЕЛАРУСЬ**

ШТОМЕСЯЧНЫ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЧАСОПІС

№ 7 (312)

Орган Саюза пісьменнікаў БССР

Ліпень 1971 г.

Заснаваны ў 1944 г.

Выдавецтва «Полымя» Дзяржаўнага Камітэта Савета Міністраў БССР па друку



Сяргей Осіпавіч ПРЫТЫЦКІ.

# ВЕРНЫ СЫН БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Беларускі народ панёс цяжкую страту — 13 чэрвеня 1971 года памёр выдатны партыйны і дзяржаўны дзеяч Савецкай Беларусі, член ЦК КПСС, намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Старшыня Вярхоўнага Савета БССР, член Бюро ЦК КПБ Сяргей Осіпавіч Прытыцкі. Не стала стойкага камуніста-ленінца, слаўнага сына беларускага народа, які так многа зрабіў для яго свабоды і шчасця.

Сяргей Осіпавіч нарадзіўся ў 1913 годзе ў вёсцы Гаркавічы Гродзенскай вобласці ў сям'і селяніна бедняка. З маленства пазнаў ён галечу, цяжкую працу на кулака і пана і ўжо ў юнацкія гады ўключыўся ў актыўную рэвалюцыйную барацьбу працоўных Заходняй Беларусі супраць буржуазнага ладу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных. Прытыцкі не ведаў ні страху, ні стомы, не шкадаваў ні сіл, ні самога жыцця ў змаганні з ворагамі за лепшую долю свайго народа.

З'яўляючыся кіраўніком камсамольскай падпольнай арганізацыі, Сяргей Осіпавіч праявіў сябе смелым і мужным важаком моладзі. У 1932 годзе 19-гадовым юнаком ён уступае ў рады Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і назаўсёды звязвае з партыяй, з народам сваё жыццё, свой лёс. Прытыцкі выконвае самыя небяспечныя заданні, нястомна праводзіць работу ў масах, праяўляючы выключную адвагу і смеласць. Нават прыгавораны да смяротнай кары, малады камуніст не пахіснуўся, смела глядзеў у вочы смерці і мужна перанёс пакуты ад катаванняў і адзіночнай турэмнай камеры, верачы ў перамогу вялікай справы, за якую змагаўся.

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў верасні 1939 года Сяргей Осіпавіч Прытыцкі з уласцівай яму энергіяй уключаецца ў вялікую работу па ўмацаванні тут Савецкай улады. Яму, бясстрашнаму камуністу, стойкаму рэвалюцыянеру, выпала шчасце адкрываць у 1939 годзе Народны сход у Беластоку, выступаць на сесіі Вярхоўнага Савета СССР з выказанай усім народам прапановай аб уз'яднанні Заходняй Беларусі ў адзіную братнюю сям'ю савецкіх рэспублік. Запаветная мара працоўных Заходняй Беларусі, якую выказаў Сяргей Прытыцкі ў сваёй прамове, здзейснілася.

Пасля таго, як Заходняя Беларусь стала свабоднай, С. О. Прытыцкі абіраецца намеснікам старшыні Беластоцкага аблвыканкома. Ён аддае ўсе сілы таму, каб наладзіць жыццё на вызваленай зямлі.

Суровыя выпрабаванні выпалі на долю С. О. Прытыцкага ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Таленавіты арганізатар, вопытны палітработнік, ён стаў адным з кіраўнікоў Польскага штаба партызанскага руху, увесь аддаўся

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы